# ПЛАН-КАНСПЕКТ СТЫМУЛЮЮЧАГА ЗАНЯТКА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў IV КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ПА СТАРОНКАХ “БУСЛІКА” І НЕ ТОЛЬКІ”

*Рабчаева Алена Іванаўна*

**Мэта:** стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні тэм і выкарыстанні атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці.

**Задачы:**

ствараць умовы для пашырэння ведаў, уменняў і навыкаў, прадугледжаных праграмай па розных тэмах;

развіваць кемлівасць, моўнае пачуццё, уменне хутка знаходзіць правільны адказ;

выхоўваць самастойнасць у працы, супрацоўніцтва пры рабоце ў парах, цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

**Форма правядзення:** вучэбны занятак-падарожжа.

**Абсталяванне:** індывідуальныя карткі з заданнямі па колькасці вучняў, карткі з назвамі старонак падарожжа — “Мнагазначныя словы”, “Правапіс”, “Адпачынак”, “Вострi зрок”, “Рэбусы”, “Фразеалагізмы”, мабільныя тэлефоны для сканіравання QR-кодаў.

## Ход занятка

### I. Арганізацыйны этап.

*Празвінеў званок і змоўк.*
*Каб на сваё месца прайсці,*
*Успомнім дружна мы*
*Сінонімы да слова ісці.*

Дзеці называюць *(Крочыць, тупаць, плесціся, валачыцца, кавыляць, рухацца, накіроўвацца, адпраўляцца, хадзіць).*

Дзеці, а кім вы з’яўляецеся адзін да аднаго? *(Аднакласнікі, сябры).*

Падбярыце сінонімы да слова сябар. *(Таварыш, прыяцель).*

Падбярыце антонімы да слова сябар. *(Вораг, непрыяцель).*

Ці ёсць сярод вас такія дзеці? Спадзяюся, што на сённяшнім занятку вы праявіце такія якасці, як сяброўства і ўзаемадапамога.

Якім вы бачыце наш занятак? *(Вясёлым, займальным, цікавым, пазнавальным і г.д.).*

Спадзяюся, што агульнымі намаганнямі занятак менавіта такім і атрымаецца.

### II. Актуалізацыя ведаў, уменняў і навыкаў.

Кожны год у лютым праводзіцца гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры. Конкурс звязаны з назвай птушкі — сімвала нашай краіны. Хто гэта птушка? *(“Буслік”).*

Настаўнік адкрывае запіс тэмы на дошцы.

Сёння мы здзейснім падарожжа па конкурсных заданнях. Я прапаную пачаць з размінкі.

### III. Практычная частка.

**3.1. Размінка.** Я задам 5 пытанняў. Калі вы правільна адкажаце на пытанне, атрымаеце жэтон “Бусліка”.

1. Прывядзіце прыклад слова, у якім ёсць сто зычных. *(**Сто**л, **сто**гн, **сто**г, **сто**п).*

2. Падбярыце беларускі адпаведнік да прыказкі: “Не откладывай на завтра то, что можно сделать сегодня”. *(Адклад не ідзе на лад).*

3. Адгадайце загадку-метаграму

*З “м” расту я на градзе,*
*З “р” я поўзаю ў вадзе. ( Мак — рак).*

4. Якая літара ў беларускай мове гука не абазначае? *(Мяккі знак).*

5. Доўгая шыя, чырвоныя боты, белы ды шэры ідзе ля дарогі. *(Бусел).*

**3.2. Работа на індывідуальных картках.**

Крыху размяліся. А цяпер возьмем з сабой такія якасці, як кемлівасць, увагу, а ляноту і рассеянасць схаваем ў куфар. Падыходзяць да куфара.

*Лянота, лянота,*
*Ідзі ў балота,*
*У лесе схавайся,*
*Да нас не чапляйся. ( Галіна Багданава).*

Мы пачынаем падарожжа па старонках гульні-конкурса “Буслік”. За кожнае правільна выкананае заданне атрымаеце жэтон — “буслік”.

**Старонка “Мнагазначныя словы”.**

Бываюць такія словы, якія пішуцца і вымаўляюцца аднолькава, але маюць розныя значэнні. Як называюцца такія словы? Прывядзіце свае прыклады мнагазначнасці слоў. *(Адказы дзяцей).*

А цяпер адшукайце заданне №1 на сваіх лістах. Падкрэсліце мнагазначныя словы. Растлумачце іх значэнне ў пары.

Колькі значэнняў маюць мнагазначныя словы з верша?

Абвядзіце літару з патрэбным адказам.

А) адно, **Б) два**, В) тры, Г) чатыры, Д) пяць.

Кожны з дзяцей называе адказ. Затым тлумачыцца кожнае слова.

**Старонка “Правапіс”.**

Пераходзім да наступнай старонкі.

Зімой Сярожа адпачываў у бабулі ў вёсцы. Разам з дзядулем-лесніком ён часта хадзіў у абход.

Пісьмо пра жыццё звяроў у лесе хлопчык вырашыў напісаць у газету “Зорька” і адправіць па электроннай пошце. Аднак здарылася непрадбачанае: у камп’ютар прабраўся злосны Камп’ютарны Вірус, які сапсаваў некаторыя словы. Трэба дапамагчы Сярожу “вылечыць” камп’ютар! Колькі памылак трэба выправіць? Выпраўце памылкі ў тэксце задання №2, падлічыце іх колькасць і абвядзіце літару з правільным адказам.

А) 19, Б) 16, В) 17, **Г) 18**, Д) 15

Кожны з дзяцей пасля выканання задання №1 на-

зывае свой адказ. Затым вучнямі тлумачыцца правапіс кожнага слова. Пажадана выкарыстаць QR-код, дзе кожнае месца памылкі ў тэксце ліста пазначана чырвоным колерам (малюнак 1).

а ж
Зіма – пора асаблiва цяшкая для
я ў
лесных жыхаров. Для невялікіх
г
звяркоў і птушак снех – гэта
з ц
сховiшча, якое надейна бароніть ад
з і
завей і іншай непагаді. Ліce и ваўку
э ў ц ы д
треба долга шукать спажiву. Солатка
з е
спяць зімой пад надейнай снігавой
коўдрай краты, дрэмлюць мышы-
с ў
землярыйкі. Безтурботна пахрапвае у
сваёй норцы барсук.

Малюнак 1. – Варыянт задання

**Старонка "Адпачынак".**

Каб лягчэй было далей падарожнічаць па старонках, трэба быць у добрай форме. Я прапаную вам з дапамогай музычнай фізкультхвілінкі падтрымаць сваю форму.

*Спасылка на музычную фізкультхвілінку (на выбар).*

**Старонка "Востры зрок".**

Для выканання наступных заданняў нам неабходны востры зрок.

Знайдзі ў табліцы назвы месяцаў (малюнак 2). Заданне №3.

Колькі слоў-назваў месяцаў ты знайшоў?
**А) 6**, Б) 4, В) 5, Г) 3, Д) 2 .

*Вучні могуць праверыць, якія месяцы "схаваныя", выкарыстаўшы QR-код.*

Знайдзі "схаваныя" ў сказах імёны. Заданне №4.

Та**та ра**скрыў цікавую размалёўку.

Я люблю **боў**лінг. Колькі імён ты знайшоў?

А) 1, Б) 4, В) 3, **Г) 2**, Д) няма ніводнага[1].

**Фізкультмінутка для вачэй.**

Мы ўжо выканалі дастатковую колькасць заданняў. Вочкі вашы стаміліся. Каб яны не падвялі вас пры выкананні наступных заданняў, давайце іх умацуем з дапамогай спецыяльных практыкаванняў (па трэнажоры).

Вочкі заплюшчылі, вочкі расплюшчылі,
Уверх паглядзелі, уніз апусцілі,

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| с | а | к | а | в | і | к | і |
| д | л | ё | т | м | ж | н | і |
| с | т | у | д | л | р | а | в |
| в | в | г | з | ю | т | ы | е |
| л | е | а | е | н | ь | е | н |
| і | р | а | с | е | н | ь | ь |
| с | т | а | п | а | д | х | а |

Малюнак 2. – Варыянт задання

Убок улева, убок управа,
Дружна возьмемся за справу.

**Старонка "Рэбусы".** Заданне №5.

Прапаную папрацаваць ў парах і расшыфраваць рэбусы.

Размясціце словы ў правільным парадку, як яны пачынаюцца з пачатку года. Выберыце літару з правільным парадкам адказу.

А) 1, 3, 2, 4 **Б) 3, 2, 1, 4** В) 3, 4, 1, 2 Г) 4, 3, 2, 1 Д) няма ніводнага[2].

**Старонка "Фразеалагізмы".** Заданне №6.

Перад намі апошняя старонка ў нашым падарожжы. Папрацуйце над наступным заданнем у пары.

Замяні дзеясловам кожны наступны выраз. Устанаві суадносіны паміж фразеалагізмам і дзеясловам. Абвядзі патрэбны варыянт адказу.

**Д) 1Ж, 2А, 3Д, 4 З, 5В, 6 Б, 7Е, 8 Г** *(Правільны адказ).*

**IV. Падвядзенне вынікаў.**

Скончылася наша падарожжа. Якія старонкі падарожжа для вас былі самымі пазнавальнымі? Падлічыце заробленыя жэтоны.

Ацаніце сваю работу на занятку:

"Я задаволены сваёй работай...", "У мяне ўзніклі цяжкасці пры..."

**V. Рэфлексія.**

**5.1. Хвілінка творчасці.**

Ці апраўдаў наш занятак вашы чаканні?

Ці быў ён такім, якім вы яго хацелі бачыць?

Паспрабуйце скласці верш па рыфмаваных словах.

______________працавалі,
______________ зараблялі,
______________чыталі,

[1]Пасля адказаў вучняў дадзеныя заданні каменцірукоцца.
[2]Як утвараўся кожны рэбус, вучні могуць прасачыць ці праверыць сябе, выкарыстаўшы QR-код на картцы.

_______________правяралі.

**5.2. Прыём “Выбар”.**

*На цэнтральнай дошцы і шторках змешчаны карткі з фразеалагізмамі “Як на іголках”(неспакойна, з хваляваннем), “Ні ў зуб нагой” (нічога не зразумела), “На ўсе сто” (выдатна).*

Як вы адчувалі сябе на занятку? Займіце месца каля таго фразеалагізма, які вам падыходзіць.

*Дата поступления в редакцию: 04.04.2024*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ УЧЕБНОГО ЗАНЯТИЯ ПО УЧЕБНОМУ ПРЕДМЕТУ «МАТЕМАТИКА» В IV КЛАССЕ ПО ТЕМЕ «ЗАКРЕПЛЕНИЕ. УМНОЖЕНИЕ И ДЕЛЕНИЕ МНОГОЗНАЧНЫХ ЧИСЕЛ»

*Рожкова Антонина Алимпиевна*

**Цель:** закрепление и систематизация знаний учащихся об умножении и делении многозначных чисел через письменное и устное решение примеров; решение практико-ориентированных задач на движение.

**Задачи:**

способствовать закреплению навыков письменного умножения и деления многозначных чисел на однозначное число;

создать условия для развития внимания, логического мышления, адекватной самооценки учащихся;

содействовать воспитанию коммуникативных качеств при работе в парах и группах, формировать интерес к уроку математики.

**Тип урока:** урок закрепления и обобщения знаний.

**Оборудование:** учебник, демонстрационный материал (слайды), листы для индивидуальной работы, карточки для работы в группах, сигнальные карточки «Светофор», магниты, оценочные листы, таблица «Оцени себя», видеоролик с физкультминуткой.

## Ход урока

**I. Организационный этап.**

*Я хочу, чтобы вы улыбались.*
*Работой своей все довольны остались.*
*Чтоб каждый из вас ощутил свой успех.*
*Чтоб этот урок порадовал всех.*

**II. Этап проверки домашнего задания. Взаимопроверка.**

Обменяйтесь тетрадями и оцените работу соседа по парте, используя оценочный лист. (Приложение).

Прочитайте ответы числовых выражений. Какие это числа? *(Многозначные).*

**III. Этап целеполагания, постановки учебной задачи.**

Как вы думаете, какова будет тема нашего урока?

Какие учебные задачи мы с вами будем решать?

**IV. Этап актуализации субъективного опыта учащихся.**

**4.1. Устный счет.**

*Диктант задач* «Познавательные задачи»[1].

— Стриж за один раз приносит в клюве птенцам 400 насекомых. Прилетает стриж к гнезду 20 раз в день.

— На свете 3000 видов пауков. Из них 25 ядовитые.

— Ласточка может пролететь 240 км за 3 часа.

— Одной лошади на сутки надо 8 кг сена. На конюшне имеется 1600 кг сена.

— Если сдать 60 кг макулатуры, сохранишь от вырубки одно дерево. В первом полугодии учащиеся нашего класса собрали и сдали 420 кг макулатуры.

— Вертолет Ми-26 может перевезти груз массой 200 ц, а вертолёт Ми-8 — 40 ц.

*Проверка.*




*Самооценка.* (Приложение).

Ответы задач запишите в порядке возрастания.

Как можно сгруппировать числа? (Устно).

**4.2. Игровое упражнение «Помогите Незнайке»** (Ошибки Незнайки).

Проверьте, правильно ли выполнены вычисления. Найдите ошибку. Объясните, где и почему ошибся Незнайка.

1. *Проверка.*




[1]Читается только условие задачи. Учащиеся сами ставят вопрос и записывают решение.